# Ратуемся спадчынай

✓З **7 снежня** ў кальцавой галерэі 2-га паверха Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі працуе кніжная выстава **«Калядная зорка»**. Новы год і Каляды – асаблівыя святы, прасякнутыя верай у чараўніцтва, напоўненыя дзівосамі, радасцю, зімовымі забавамі, падарункамі. Для беларусаў канец і пачатак года – гэта не проста даты. Гэта два тыдні радасці і весялосці, імя якім – Каляды. Раней за гэты час беларусы паспявалі развітацца з грузам старога года, накрыць на стол тры куцці, абавязкова наведаць царкву ці касцёл, абысці суседзяў са шчырымі зычаннямі дабрабыту, паваражыць на наступны год. Выстава складаецца з некалькіх раздзелаў і расказвае пра гісторыю народных свят, навагоднія і калядныя традыцыі, прыкметы і павер'і, звязаныя з імі. Экспазіцыю адкрывае раздзел «Каляды на Беларусі», у якім асаблівая ўвага нададзена традыцыі святкавання нашымі продкамі Новага года.



У раздзеле «Каляды ў свеце» наведвальнікі даведаюцца пра святкаванне Новага года і Нараджэння Хрыстовага ў розных краінах. Цэнтральнае месца адведзена раздзелу «Цёплыя вечары», у якім расказвацца, як упрыгожыць кватэру, арыгінальна аформіць падарункі родным і блізкім, змайстраваць маскі, сувеніры і елачныя ўпрыгожанні. Бавіць сямейныя зімнія вечары дапамогуць кнігі з раздзела «Калядныя чытанні», дзе прадстаўлены казачныя аповесці і апавяданні розных аўтараў. У зборніку «Беларуская зіма» маленькія наведвальнікі пазнаёмяцца з лепшымі вершамі, казкамі, апавяданнямі вядомых беларускіх пісьменнікаў пра зіму і навагоднія святы.

Выстава працуе па 16 студзеня 2023 г.